4. Праблема прыроднага і антрапагеннага эўтрафіравання вадаёмаў.
5. Ацэнка водных рэсурсаў для вырашэння гаспадарчых задач.
6. Каналы Беларусі і праблемы іх аднаўлення.
7. Гісторыя адміністрацыйных падзелаў нашага.... (гораду, раёну, сельсавету).
8. Геаграфія археалагічных, гістарычных, культурных помнікаў і мясцін нашага.... (гораду, раёну, сельсавету).
9. Гісторыя назваў населеных пункатаў, рэкаў і азёр нашага.... (гораду, раёну, сельсавету).
10.Гісторыя назваў вуліц нашага.... (горада, мястэчка).
11.Гісторыя прозвішчаў нашага роднага населенага пункту.

**Прыкладныя тэставыя заданні**

1. Этнічная супольнасць людзей, якіх аб’ядноўваюць агульнае паходжанне і гістарычны лёс, адзіныя этнічная_тэрыторыя, мова, самасвядомасць, ментальнасць, культура гэта -- :

1) дзяржава;
2) род;
3) сям’я;
4) этнас

2. Тэрыторыя кампактнага рассялення пэўнага народа, з якой цесна звязаны яго этнагенез, жыццёвы ўклад і гістарычны лёс, гэта -- :

1) вобласць;
2) дзяржава;
3) этнічная тэрыторыя;
4) раён

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Суаднясіце аўтараў і іх працы:

1. А.Кіркор — а) “Падарожжа на Палессі і беларускім краі”,
2. П.Шпілеўскі — “Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках”;
3. У.Сыракомля — б) “Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню”;
4. Я.Чачот — в) “Вясковыя песні”;

г) “Вандроўкі па маіх былых ваколіцах”.

1) 1а, 2б, 3г, 4в; 3) 1г, 2а, 3б, 4в;
2) 1б, 2а, 3г, 4в; 4) 1в, 2а, 3г, 4б.

2. 1. Я.Тышкевіч — а) “Успаміны з Палесся, Валыні і Літвы”;
2. Ю.Крашэўскі — б) “Апісанне Барысаўскага павета”;
3. Я.Баршчэўскі — в) “Беларусь! Некалькі слоў аб паэзіі простых людзей гэтай нашай польскай правінцыі...”;
4. А.Рыпінскі — г) “Курганы і русалкі”

1) 1г, 2б, 3а, 4в; 3) 1б, 2а, 3г, 4в;
2) 1в, 2а, 3г, 4б; 4) 1а, 2б, 3г, 4в.

3. 1. П.Баброўскі — а) “Беларуская Смаленшчына з суседзямі”;
2. С.Максімаў — б) “Гродзенская губерня”;
3. І.Насовіч — в) “Слоўнік беларускай мовы”;
4. Ю.Крачкоўскі — г) “Нарысы быту заходнерускага селяніна”

1) 1б, 2а, 3в, 4г; 3) 1в, 2а, 3б, 4г
2) 1а, 2б, 3в, 4г; 4) 1г, 2б, 3в, 4а.

4. 1. А.Семянтоўскі — а) “Этнаграфічны агляд Віцебскай губерні”;
2. П.Шэйн — б) “Беларускія песні”;
3. М.Нікіфароўскі — в) “Беларускі зборнік”;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Е.Раманаў — г) Нарысы простанароднага жыцця-быцця ў “Віцебскай Беларусі і апісанне прадметаў ужытку”.

1) 1а, 2б, 3г, 4в; 3) 1г, 2б, 3а, 4в;

2) 1б, 2а, 3г, 4в; 4) 1в, 2б, 3г, 4а

5. 1. У.Дабравольскі — а) “Смаленскі этнаграфічны зборнік”;

2. М.Янчук — б) “Песні пінчукоў”;

3. М.Доўнар-Запольскі — в) “Па Мінскай губерні”;

4. А.Багдановіч — г) “Перажыткі старажытнага светапогляду ў беларусаў”.

1) 1а, 2в, 3б, 4г; 3) 1б, 2а, 3в, 4г;

2) 1в, 2а, 3б, 4г; 4) 1г, 2в, 3б, 4а.

6. Паходжанне народа, працэс яго станаўлення і фарміравання ў выніку міксацыі, асіміляцыі, інтэграцыі розных плямён і народаў – гэта:

1) дыфузія; 3) эвалюцыя;

2) этнагенез; 4) усё пералічанае.

7. Гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі, які займае басейн верхняй Прыпяці і яе прытокаў Піны і Ясельды, на захадзе ўключае правабярэжжа Заходняга Буга, -- гэта:

1) Усходняе Палессе; 3) Заходняе Палессе;

2) Цэнтральная Беларусь; 4) Паазер’е.

8. Этнаграфічная група беларускага насельніцтва, жыхары Палесся – гэта:

1) беларусцы; 3) беларусы;

2) дрыгавічы; 4) палешукі.

9. Гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі, які займае басейн Нёмана і яго прытокаў, -- гэта:

1) Цэнтральная Беларусь; 3) Панямонне;

2) Падзвінне; 4) Усходняе Палессе.

10. Невялікая група беларускага насельніцтва, якая пражывала ў балоцістым раёне басейна сярэдняй Пцічы і вярхоўях Арэсы, -- гэта:

1) беларусцы; 3) палешукі;

2) сакуны; 4) усё пералічанае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

11. Працэс змешвання прышлага насельніцтва з мясцовым (аўтахтонным) называецца:

1) эвалюцыя;
2) дыфузія;
3) асіміляцыя;
4) экзагамія.

12. Працэс міжэтнічнага ўзаемадзеяння, калі група людзей ці цэлы народ засвойвае мову і культуру іншага народа і забывае сваю, страчвае этнічную самасвядомасць, -- гэта:

1) інтэграцыя;
2) асіміляцыя;
3) славянізацыя;
4) дэмаграфія.

13. Назва аб народанасельніцтве і законамернасцях яго развіцця – гэта:

1) геаграфія;
2) дэмаграфія;
3) этнаграфія;
4) этналогія.

14. Сукупнасць уяўленняў, пачуццяў і ведаў чалавека пра сваю прыналежнасць да пэўнай нацыі, а таксама пра сваё месца і ролю ў жыцці роднага народа, - гэта:

1) ментальнасць;
2) нацыянальны характар;
3)нацыянальная самасвядомасць;
4) нацыяналізм.

15. Сукупнасць асноўных адносна ўстойлівых псіхалагічных якасцей, якія сфарміраваліся ў нацыі ў канкрэтных гістарычных, сацыяльна-культурных і прыродных умовах яе развіцця, - гэта:

1) нацыянальная самасвядомасць;
2) ментальнасць;
3) нацыяналізм;
4) нацыянальны характар.

16. Назва гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Беларусі, які займае басейн Заходняй Дзвіны, на захад распасціраецца да воз. Нарач, на поўдні – па рэдказаселеных лясных масівах паўночней Лагойска і Барысава і далей па водападзеле Дзвіны і Дняпра:

1) Цэнтральная Беларусь;
2) Падняпроўе;
3) Паазер'е;
4) Заходняе Палессе.

17. Назва гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна, які займае ўсходнюю частку Беларусі – басейны верхняга Дняпра і яго прытокаў Сажа, Друці і часткова Бярэзіны:

1) Панямонне;
2) Паазер'е;
3) Падняпроўе;
4) Усходняе Палессе.

18. Гісторыка-этнаграфічны рэгіён, які займае асноўную частку Мінскай і заходнюю ўскраіну Магілёўскай абласцей, называецца:

1) Падняпроўе;
2) Цэнтральная Беларусь;
3) Усходняе Палессе;
4) Панямонне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

19. Гісторыка-этнаграфічны рэгіён, які займае большую частку Палескай нізіны, -- гэта:

1) Заходняе Палессе;
2) Усходняе Палессе;
3) Паазер’е;
4) Падняпроўе.

20. Калі тэрыторыю Беларусі альбо яе частку пакрываў дняпроўскі ляднік:

а) 600 − 560 тыс. гадоў назад;
б) 560 − 480 тыс. гадоў назад;
в) 480 −460 тыс. гадоў назад;
г) 460 − 320 тыс. гадоў назад;
д) 320 − 250 тыс. гадоў назад;
е) 250 − 220 тыс. гадоў назад;
ж) 220 − 110 тыс. гадоў назад;
з) 110 − 95 тыс. гадоў назад?

21. Якія глебаўтваральныя пароды атрымалі найбольшае распаўсюджванне на тэрыторыі Беларусі:

а) гліны азёрна-ледавіковыя;
б) суглінкі лёсавыя і лёсападобныя;
в) суглінкі марэнныя;
г) супескі водна-ледавіковыя і старажытнаалювіяльныя;
д) супескі марэнныя;
е) пяскі водна-ледавіковыя;
ж) торф;
з) сучасны алювій?

22. Якая рака, што цячэ ў межах Беларусі ад вытокаў да вусця, мае найбольшую працягласць:

а) Бярэзіна;
б) Вілія;
в) Дняпро;
г) Заходні Буг;
д)Заходняя Дзвіна;
е) Нёман;
ж) Прыпяць;
з) Сож?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

23. Якая з рэк Беларусі характарызуецца максімальным сярэднешматгадовым расходам вады і з’яўляецца самай паўнаводнай:

а) Бярэзіна;

б) Вілія;

в) Дняпро;

г) Заходні Буг;

д)Заходняя Дзвіна;

е) Нёман;

ж) Прыпяць;

з) Сож?

24. Азёры якога тыпу з’яўляюцца самымі распаўсюджанымі на тэрыторыі Беларусі:

а) астатковыя;

б) ледавіковыя падпрудныя;

в) ледавіковыя экзарацыйныя;

г) ледавіковыя тэрмакарставыя;

д) старычныя;

е) карставыя?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ДАПАМОЖНЫ РАЗДЕЛ

## РАЗМЕРКАВАННЕ ВУЧЭБНАГА ЧАСУ

| №П/П | Назва раздзелаў і тэмы | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | Лекцыі | Семінарскія заняткі |
| 1. | Гістарычная геаграфія Беларусі – спецыяльная гістарычная дысцыпліна | | 4 | 4 |
| 2. | Гістарычная фізічная геаграфія | | 8 | 4 |
| 3. | Гістарычная геаграфія насельніцтва | | 8 | 4 |
| 4. | Гістарычная эканамічная геаграфія | | 8 | 6 |
| 5. | Гістарычная палітычная геаграфія | | 8 | 6 |
| | **Колькасць гадзін:** | **60** | **36** | **24** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗМЕСТ ВУЧЕБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**1.1.Гістарычная геаграфія Беларусі – спецыяльная гістарычная дысцыпліна.**

Прадмет,змест і задачы курса “Гістарычная геаграфія Беларусі”. Асноўныя элементы, метады і крыніцы гістарычнай геаграфіі. Развіццё гістарычнай геаграфіі Беларусі як навуковай дысцыпліны. Узаемасувязь гістарычнай геаграфіі з сумежнымі навукамі: гісторыяй, геаграфіяй, археалогіяй, этнаграфіяй, антрапалогіяй, біялогіяй.

**1.2. Гістарычная фізічная геаграфія.**

*Рэльеф.* Агульныя рысы будовы паверхні Беларусі. Асноўныя ўзвышшы, раўніны і нізіны, рачныя даліны. Галоўныя фактары і ўмовы ўтварэння рэльефу Беларусі. Сучасныя рэльефаўтваральныя працэсы. Асноўныя генетычныя тыпы рэльефу: ледавіковы, водна-ледавіковы, азёрна-ледавіковы, алювіяльны, азёрна-алювіяльны, флювіяльны, суфазійна-карставы, эолавы, азёрна-балотны, схілавы, гравітацыйны, тэхнагенны. Занальныя рысы рэльефу. Геамарфалагічнае раянаванне. Вобласці Беларускага Паазер’я, Цэнтральнабеларускіх краявых ледніковых узвышшаў і град (Заходне і Ўсходне-Беларуская падвобласці), раўнін і нізін Перадпалесся, нізін Палесся. Рэльеф абласцей і геамарфалагічных раёнаў. Гаспадарчае значэнне рэльефу.

*Клімат.* Агульныя рысы клімату Беларусі. Кліматаўтваральныя працэсы і фактары. Тыпы паветраных масаў, іх паўтаральнасць. Цыкланічная і антыцыкланічная дзейнасць. Пераважаючыя напрамкі вятроў. Цеплавы рэжым Беларусі. Тэмпература паветра і яе тэрытарыяльнае размеркаванне па сезонах года. Тэмпература глебы. Водны рэжым Беларусі. Абсалютная і адносная вільготнасць паветра. Атмасферныя ападкі, іх размеркаванне па тэрыторыі і сезонах года. Снегавое покрыва, яго размеркаванне, магутнасць і ўстойлівасць. Небяспечныя метэаралагічныя з’явы: навальніцы, туманы, град, замаразкі, мяцеліцы, засухі і інш.

*Унутраныя воды.* Гідраграфічная сетка і водныя рэсурсы Беларусі. Асаблівасці гідраграфіі прыродных раёнаў Беларусі. Рачная сетка і сцёк. Водападзелы і галоўныя басейны. Працягласць рэк і гушчыня рачной сеткі. Тыпы рэк. Гаспадарчае значэнне рэк. Уплыў антрапагеннага ўздзеяння на сцёк. Праблема малых рэк.

Каналы і іх выкарыстанне. Тыпы каналаў. Перспектывы будаўніцтва новых каналаў.

Азёры, іх колькасць і размяшчэнне. Тыпы азёрных катлавін. Азёрнасць тэрыторыі. Гідралагічны рэжым азёр: жыўленне, ваганне ўзроўня, тэмпературны і лядовы рэжым. Жыццё ў азёрах. Класіфікацыя азёр. Характарыстыка асноўных азёрных груп. Асаблівасці выкарыстання прыродных рэсурсаў азёр.

Вадасховішчы і сажалкі, іх гаспадарчае значэнне і ўплыў на навакольнае асяроддзе. Падземныя воды. Артэзіянскія басейны на тэрыторыі Беларусі.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГПУ

*Глебавае покрыва.* Фактары і працэсы глебаўтварэння на тэрыторыі Беларусі. Механічны склад глеб. Класіфікацыя глеб. Асноўныя тыпы і падтыпы глеб, іх распаўсюджванне. Аўтаморфныя глебы. Паўгідраморфныя (забалочаныя) глебы. Гідраморфныя (тарфяна-балотныя) глебы. Структура глебавага покрыва. Эрозія глеб і барацьба з ёй. Комплексная меліярацыя. Глебава-геаграфічнае раянаванне. Характарыстыка глебавых правінцый. Зямельныя рэсурсы.

*Расліннасць.* Гісторыя фарміравання расліннага покрыва. Сучасны склад флоры. Элементы флоры: занальныя, інтразанальныя і азанальныя віды. Інтрадукаваныя расліны (культурныя палёў, лекавыя, дэкаратыўныя). Прыроднае расліннае покрыва Беларусі. Тыпы расліннасці (занальная, інтразанальная, азанальная).

Лясны тып расліннасці. Лясістасць тэрыторыі Беларусі. Класіфікацыя экалагічных тыпаў лесу. Асноўныя фармацыі лясоў. Тыпы лясоў: хваёвыя, яловыя, шыракалістыя, шыракаліста-хвойныя, дробналістыя лясы. Гаспадарчае выкарыстанне, аднаўленне і ахова лясоў Беларусі. Экалагічныя праблемы лясоў.

Лугавы тып расліннасці. Класы лугоў: поймавыя і пазапоймавыя. Тыпы лугоў: поймавыя высокага, сярэдняга і нізкага ўзроўняў, сухадольныя, нізінныя. Гаспадарчая ацэнка асноўных лугавых фармацый. Асаблівасці выкарыстання лугавой расліннасці ў Беларусі.

Балотная расліннасць. Асноўныя тыпы балот: вярховыя, пераходныя, нізінныя. Фларыстычны склад і асаблівасці будовы фітацэнозаў асноўных тыпаў балот Беларусі. Раянаванне. Гаспадарчае выкарыстанне і ахова балотнай расліннасці.

Водная расліннасць. Асаблівасці распаўсюджання гіграфітаў і гідрафітаў у вадаёмах рэспублікі. Расліннасць узбярэжжаў і водных акваторый.

*Жывёльны свет.* Агульная характарыстыка. Роля чалавека ў змяненні відавога складу фауны. Сучасны склад. Акліматызаваныя віды. Прамысловыя жывёлы. Жывёльны свет лясоў, вадаёмаў і ўзбярэжжаў, балот і заліўных лугоў, палёў і лугоў, пасяленняў чалавека. Гаспадарчае значэнне. Зоагеаграфічнае раянаванне Беларусі. Праблемы выкарыстання і аховы жывёльнага свету Беларусі.

*Ахова прыроды*

Прыродаахоўнае заканадаўства. Ахова нетраў, паветра, водаў, глеб, раслін і жывёл. Ахова ландшафтаў. Тыпы прыродаахоўных тэрыторый Беларусі. Прыродныя нацыянальныя паркі і запаведнікі: Белавежская пушча, Браслаўскі, Нарачанскі, Прыпяцкі, Бярэзінскі, Палескі. Заказнікі і помнікі прыроды рэспубліканскага і мясцовага значэння. Перспектывы развіцця сеткі прыродаахоўных аб’ектаў. Чырвоная кніга Беларусі.

*Прыроднае раянаванне*

Фізіка-геаграфічнае раянаванне. Прыродныя комплексы ў межах Беларусі. Фізіка-геаграфічныя падзоны, правінцыі, акругі і раёны. Ландшафты. Занальныя і правінцыяльныя асаблівасці ландшафтаў. Ландшафтнае раянаванне. Антрапагенныя ландшафты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паазёрская правінцыя, Заходне-Беларуская правінцыя, Усходне-Беларуская правінцыя, Перадпалеская правінцыя, Палеская правінцыя: межы, агульная характарыстыка прыродных умоў і рэсурсаў. Выкарыстанне прыродных рэсурсаў і ахова прыроды.

*Карысныя выкапні.* Састаў, умовы залягання, утварэння і магчымасці выкарыстання. Гаручыя карысныя выкапні: нафта і спадарожны газ, буры вугаль, гаручыя сланцы і торф. Металічныя карысныя выкапні: жалезныя руды, баксіт-даўсанітавыя руды, , праяўленні каляровых металаў, рэдкіх і рэдказямельных элементаў, золата. Неметалічныя карысныя выкапні: горна-хімічная сыравіна і будаўнічыя матэрыялы. Каменныя і калійныя солі, гіпс і ангідрыт, фасфарыты, даламіты, сапрапелі, трэпелы і апокі. Цэментавая і гліністая сыравіна: крэйда, мергель, лёгкаплаўкія, вогнетрывалыя і тугаплаўкія гліны, каалін. Шкляныя і фармовачныя пяскі. Будаўнічы камень: граніты, дыярыты, дэвонскія даламіты, ледавіковыя валуны. Цагельныя гліны, будаўнічыя пяскі, пясчана-жвіравыя сумясі. Бурштын, алмазы, графіт, мароны дуб. Вадкія карысныя выкапні: прэсныя і мінеральныя падземныя воды, металаносныя расолы. Экалагічныя праблемы пошукаў і здабычы карысных выкапняў.

**1.3. Гістарычная геаграфія насельніцтва**

Старажытнейшае насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў эпоху старажытнакаменнага веку. Праблемы міграцыі і аўтахтоннасці. Змена этнічнага складу насельніцтва ў эпоху бронзы. Перадумовы фарміравання беларускага этнасу ў раннім сярэднявеччы. Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі. Фарміраванне першапачатковых усходне-славянскіх этнічных супольнасцей: дрыгавічоў, радзімічаў, крывічоў. Праблемы каланізацыі і заселенасці краіны ў сярэднявеччы. З’яўленне на беларускіх землях пасяленняў яўрэяў, татараў, русскіх, палякаў, літоўцаў, латышоў і інш. Становішча, заняткі гэтых нацыянальных супольнасцей і іх узаемаадносіны з мясцовым беларускім насельніцтвам. Лакалізацыя населеных пунктаў, іх тыпы і функцыі: горад, мястэчка, вёска,сяло, фальварак, засценак, аколіца, хутар, двор, сядзіба і інш. Карта населеных пунктаў Беларусі ў 13-16 ст. Дэмаграфія. Змены ў тапаграфіі населеных пуктаў рэгіёнаў да 19 стагоддзя. Карта населеных пунктаў Беларусі ў 19-21 ст. Асаблівасці працэсу ўзнаўлення насельніцтва краіны. Полаўзроставая і сямейная структура, яе тэрытарыяльная дыферэнцыяцыя.
Міграцыйная рухомасць насельніцтва. Формы і напрамкі знешніх і ўнутраных міграцый. Сучасныя экалагічныя міграцыі. Інтэлектуальныя страты ў выніку павялічэння эміграцыі.

**1.4. Гістарычная эканамічная геаграфія**

Гаспадарчыя заняткі насельніцтва Беларусі ў дагістарычны час і ў сярэднявеччы. Земляробства. Сістэмы земляробства. Жывёлагадоўля. Уплыў прыродна-кліматычных і сацыяльна-эканамічных фактараў на развіццё земляробства і жывёлагадоўлі.

Прамысловыя і рамесныя заняткі. Здабываючыя промыслы:збіральніцтва, рыбалоўства, паляўніцтва, пчалярства, лясныя і лесахімічныя промыслы. Рамёствы:ткацтва, вышыўка, кавальства, дрэваапрацоўка, ганчарства, пляценне, скураныя рамёствы і інш.Іх роля і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

месца ў быце беларусаў. Гандаль і гандлёвыя сувязі. Дарогі і камунікацыйныя шляхі.Гаспадарчая спецыялізацыя рэгіёнаў Беларусі. Развіццё і геаграфічнае размяшчэнне прамысловай вытворчасці рэгіёнаў Беларусі ( рамесныя майстэрні, мануфактуры, фабрыкі, заводы).

**1.5. Гістарычная палітычная геаграфія**

Палітычныя, культурныя, этнічныя межы на тэрыторыі Беларусі ў дагістарычны час. Тэрытарыяльна-палітычныя аб'яднанні— племенныя саюзы ("княжэнні") крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў. Адміністрацыйны падзел краіны ў 9-13 стагоддзях. Княствы, землі. Адміністрацыйная сітуацыя на Беларусі ў часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай:княствы, намесніцтвы, ваяводствы, паветы, староствы. Адміністрацыйная сітуацыя на Беларусі ў часы Расійскай імперыі: губерніі, генерал-губернатарствы, уезды, воласці. Беларускія землі ў складзе БНР, ССРБ, РСФСР, буржуазнай Польшчы. Першае і другое ўзбуйненне БССР. Акругі, раёны, абласны падзел. Сучасны адміністрацыйна- тэрытарыяльны падзел Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная**


7. Гурскі, Б.М., Фізічная геаграфія Беларусі /Б.М. Гурскі, К.К. Кудло і інш.. - Мн., 1995.
8. Матвеев, А.В., Рельеф Белоруссии / А.В. Матвеев, Б.Н. Гурский, Р.И, Левицкая, Р.И. - Мн.: Университетское, 1988.
9. Кириенко, Е.Г. Социально-экономическая география Республики Беларусь / Е.Г. Кириенко – Мн., 2003.
10. Козловская, Л.В. Социально-экономическая география Беларуси. Курс лекций в трёх частях / Л.В. Козловская – Мн., 2002-2005.
11. Концептуальные положения регионального развития Республики Беларусь до 2015 года. // Под научной ред. Никитенко П.Г. – Мн., 2009.
12. Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2020 года. Мн., 2004.
13. Нацыянальны атлас Беларусь Мн., 2002.
14. Регионы Республики Беларусь. Статистический сборник. Мн., 2010.
15. Современная Беларусь. Т.2. Экономика и научный потенциал. Мн.,2007.
16. Экономическая и социальная география. Основы науки. М., 2003.
17. Ясовеев, М.Г. Водные ресурсы Республики Беларусь/ М.Г. Ясовеев, О.В. Шершнев, И.И. Кирвель – Мн.: БГПУ, 2005


**Дадатковая**


1. Антипова, Е.А. Регионы Беларуси: особенности демографического развития и трудовой потенциал сельской местности / Е.А. Антипова, Б.А. Манак – Мн.,2007.
2. Беларуская энцыклапедыя у 18 тамах. Т. 18 ч.2. Мн., 2005.
3. Беларусь в интеграционных проектах. Мн., 2011.
4. Лісоўскі, П.А. Землязнаўства і краязнаўства. Курс лекцый / П.А. Лісоўскі -- Мазыр, 2009.
5. Мясникович, М.В. Республика Беларусь на пути к новой экономике / М.В. Мясникович – Мн.2009.
6. Попков, В.А. Аграрная экономика Беларуси. Опыт, проблемы, перспективы / В.А. Попков – Мн., 2006.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ( дзённая форма навучання)

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Метадычнае забеспячэнне заняткаў | Літара-тура | Форма кантроля |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцый | семінары. | Лабара-торныя работы | Самаст. кіруемая работа | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | **Гістарычная геаграфія Беларусі (34)** | **36** | **24** | | | | | |
| 1.1. | **Гістарычная геаграфія Беларусі – спецыяльная гістарычная дысцыпліна (4).** | | | | | | | |
| 1.1.1. | Прадмет,змест і задачы курса "Гістарычная геаграфія Беларусі".<br>1.Вызначэнне паняццяў гістарычнай геаграфіі<br>2.Развіццё гістарычнвй геаграфіі Беларусі як навуковай дысцыпліны. | 2 | | | | Схема ўзаемасувязі гістарычнай геаграфіі з сумежнымі навукамі. | [4] | |
| 1.1.2. | Асноўныя элементы, метады і крыніцы гістарычнай геаграфіі.<br>1.Агульная характарыстыка элементаў, метадаў і крыніц гістарычнай геаграфіі.<br>2.Узаемасувязь гістарычнай геаграфіі з сумежнымі навукамі . | | | | | Схема ўзаемасувязі гістарычнай геаграфіі з сумежнымі навукамі. | [4] | |
| 1.2. | **Гістарычная фізічная геаграфія (10).** | | | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | . | | | | | | | |
| 1.2.1 | Агульныя рысы будовы паверхні Беларусі.<br>1.Галоўныя фактары і ўмовы ўтварэння рэльефу Беларусі.<br>2. Асноўныя генетычныя тыпы рэльефу.<br>3.Сучасныя рэльефаўтваральныя працэсы | 2 | | | | Карта фізічнай геаграфіі Беларусі. | [2]<br>[1] | |
| .<br>1.2.2. | Агульныя рысы клімату Беларусі.<br>1. Кліматаўтваральныя працэсы і фактары.<br>2. Цеплавы рэжым Беларусі.<br>3. Небяспечныя метэаралагічныя з'явы. | 2 | 2 | | | Карта фізічнай геаграфіі Беларусі. | [1] | |
| 1.2.3. | Гідраграфічная сетка і водныя рэсурсы Беларусі.<br>1. Асаблівасці гідраграфіі прыродных раёнаў Беларусі.<br>2. Рачная сетка і сцёк.<br>3. Азёры іх колькасць і размяшчэнне | 2 | 2 | | | Карта фізічнай геаграфіі Беларусі. | [1]<br>[11] | Рэфе-раты<br>Тэсты |
| 1.2.4.. | Глебавае покрыва, расліннасць і жывёльны свет Беларусі<br>1.Фактары і працэсы глебаўтварэння на тэрыторыі Беларусі.<br>2. Класіфікацыя глеб.<br>3. Гісторыя фарміравання расліннага покрыва. | 2 | 2 | | | Карта фізічнай геаграфіі Беларусі.<br><br>Карта фізічнай геаграфіі Беларусі. | [2]<br>[11] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 4. Агульная характарыстыка жывёльнага свету Беларусі. | | | | | | | |
| 1.2.5. | Карысныя выкапні.<br>1.Гаручыя карысныя выкапні.<br>2. Металічныя карысныя выкапні.<br>3.Неметалічныя карысныя выкапні.<br>4. Вадкія карысныя выкапні. | 4 | 2 | | | Карта фізічнай геаграфіі Беларусі. | [1]<br>[11] | |
| 1.3. | **1.3. Гістарычная геаграфія насельніцтва(6)** | | | | | | | |
| 1.3.1. | Старажытнейшае насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі<br>1.Праблемы міграцыі і аўтахтоннасці.<br>2.Этнічны склад насельніцтва. | 2 | | | | Карта геаграфіі насельніцтва | [4]<br>[5]<br>[9]<br>[10] | |
| 1.3.2.<br>. | Фарміраванне ўсходне-славянскіх этнічных супольнасцей.<br>1.Дрыгавічы. радзімічы, крывічы.<br>2. Праблемы каланізацыі і засяленасці краіны ў сярэднявеччы. | 2 | 2 | | | Карта геаграфіі насельніцтва | [4]<br>[9]<br>[10] | |
| 1.3.3 | Лакалізацыя населеных пунктаў, іх тыпы і функцыі. | 2 | | | | Карта геаграфіі насельніцтва | [4]<br>[5] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Карта населеных пунктаў Беларусі ў 13-16 стагоддзях.<br>2.Змены ў тапаграфіі населеных пунктаў рэгіёнаў да 19.стагоддзя.<br>3.Карта населеных пунктаў Беларусі ў 19-21 стагоддзях. | | | | | | [7]<br>[10] | |
| 1.4. | **Гістарычная эканамічная геаграфія (8)** | | | | | | | |
| 1.4.1. | Гаспадарчыя заняткі насельніцтва Беларусі ў дагістарычны час і ў сярэднявеччы.<br>1.Земляробства.<br>2.Жывёлагадоўля. | 2 | 4 | | | Карта эканамічнай геаграфіі Беларусі. | [3]<br>[5]<br>[8]<br>[10] | |
| .<br>1.4.2. | Прамысловыя і рамесныя заняткі.<br>1. Здабываючыя промыслы.<br>2. Асноўныя рамёствы.<br>. | 2 | | | | Карта эканамічнай геаграфіі Беларусі | [3]<br>[5]<br>[8]<br>[10] | |
| 1.4.3. | Гаспадарчая спецыялізацыя рэгіёнаў Беларусі.<br>1. Развіццё і гістарычнае размяшчэнне прамысловай вытворчасці рэгіёнаў.<br>2. Рамесныя майстэрні. Мануфактуры. Фабрыкі. Заводы. | 2 | 2 | | | Карта эканамічнай геаграфіі Беларусі | [3]<br>[5]<br>[8]<br>[10] | |
| 1.4.4 | Камунікацыйныя шляхі і транспарт Беларусі.<br>1. Дарогі.<br>2. Сухапутны транспарт.<br>3. Водны транспарт. | 2 | | | | Карта эканамічнай геаграфіі Беларусі | [7]<br>[8] | Рэфе-раты Тэсты |
| 1.5. | **Гістарычная палітычная геаграфія (8)** | | | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.51. | Межы Беларусі.<br>1.Палітычныя і культурныя, межы на тэрыторыі Беларусі ў дагістарычны час.<br>Беларусі.<br>2. Этнічныя межы на тэрыторыі Беларусі ў дагістарычны час. | 4 | 2 | | | Палітыка-адміністрацыйная карта Беларусі. | [7] | |
| 1.5.2. | Адміністрацыйны падзел краіны<br>1.Беларускія землі ў 9-13 стагоддзях<br>2.Адміністрацыйная сітуацыя на Беларусі ў часы ВКЛ.<br>3.Адміністрацыйная сітуацыя на Беларусі ў часы Рэчы Паспалітай. | 2 | 2 | | | Карты: “Вялікае Княства Літоўскае”, “Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі ў 18 стагоддзі”, “ | [7] | |
| 1.5.3. | Адміністрацыйная сітуацыя на Беларусі ў часы Расійскай імперыі.<br>1.Губерніі.<br>2.Генерал-губернатарствы.<br>3.Уезды.<br>4. Воласці. | | 2 | | | Карта : “Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі ў другой палове 19 пачатку 20 стагоддзя”. | [7] | |
| 15.4. | Тэрыторыя Беларусі ў 20-21 стагоддзях | 2 | 2 | | | Карта: “Беларуская ССР. | [7] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1.Беларускія землі ў складзе БНР, ССРБ, РСФСР, буржуазнай Польшчы.<br>2.Першае і другое ўзбуйненне БССР.<br>3. Акругі, раёны, абласны падзел.<br>4.Сучасны адміністрацыйна- тэрытарыяльны падзел | | | | | Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі ў другой палове 19 пачатку 20 стагоддзя”. | | |
| | **Усяго** | **36** | **24** | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ